**Тэма:** Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа.

**Клас** : 3

**Мэты:** даць агульнае паняцце пра выказнік, фарміраваць уменне знаходзіць дзейнік і выказнік у сказе па сэнсавых пытаннях; развіваць граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць уважлівыя адносіны да сваякоў і знаёмых, культуру маўлення.

**Абсталяванне:** падручнік, дыдактычныматэрыял па тэме, карцінкі да ўрока , надпісы на дошку, раздрукоўкі рэфлексіі прыём "Табліца"

**Ход урока**

1. **Арганізацыйны момант.**

   Дзеці ўсміхаюцца сябр сябру, каб настроіцца на ўрок. Потым дзеці чытаюць прыказку, якая напісана на дошцы "Хвіліна гадзіну зберагае".

   Што гэта значыць? Як вы разумееце гэтыя словы?

2. **Праверка дамашняга задання.**

Узаемаправерка дамашняга практыкавання. Дзеці чытаюць сказы і правяраюць суседа па парце.

1. **Чыстапісанне.**

*і ні лі*

ліпа ліпень лісце  блішчаць

Прачытать словы. Сказаць, якое слова лішняе. Чаму? ( Таму што адказвае на пытанне што рабіць, а астатнія што?)

**2. Слоўнікавае слова**

Блішчаць. Разбор слова. Падзелім на склады. Адзначаем слабыя месцы, дзе магчыма зрабіць памылку. Прапісаць яшчэ тры разы.

1. **Вывучэнне новага матэрыялу.**

   "Кошык  ідэй" ( на доску)

   - Успомнім, что мы ведаем пра галоўныя члены сказа. (Дзейнік і выказнік. Дзейнік – слова, якое абазначае пра тое што гаворыцца ў сказе, адказвае на пытанні хто што і падкрэсліваецца адной рыскай) Настаўнік вывешвае на дошку надрукаваныя часткі правіла.

   С. 70,71 – правіла чытае адзін вучань.

   Паўтараем правіла і настаўнік вывешвае на дошку часткі пра выказнік.

   Выказнік – слова, якое абазначае што гаворыцца пра дзейнік, адказвае на пытанні што рабіць? Што зрабіць? што будзе рабіць і інш. Падкрэсліваецца двума рыскамі.

***Работа па падручніку***

с. 71. практ.111 – Дапаўненнесказаўслоўнікавым словам. Вылучэнне ў сказахграматычнайасновы па пытаннях.  Адзін вучань выходзіць да дошкі і запісвае сказ, астатнія – у сшытках.

***Фіхвілінка***

Музыкальная паўза

**Сказ пад дыктоўку. Замацаванне вывучанага слоўнікавага слова.**

Пасля дажджу лісце на ліпе аж  блішчыць.

Падкрэсліць галоўныя члены сказа.

**Замацаванне  вывучанага матэрыялу.**

с 72. практ. 112  (Выпісаць з кожнага сказа дзейнік і выказнік)

1. **Падвядзенне вынікаў.**

   ***“Кошык ідэй”***

   ***Дзеці малююць ў сшытках кошых і пішуць ўсё, што запомнілі пра дзейнік і выказнік.***

**2. Рэфлексія.**

Прыём “Табліца”

- Якія веды вы здабылі сёння? Падкрэсліце ў кожным слупку слова або выраз, якія адпавядаюць вашай рабоце на ўроку:

| Урок | Я на ўроку | Вынік |
|---|---|---|
| Цікавы | Працаваў | Зразумеў матэрыял |
| Нудны | Адпачываў | Даведаўся болей, чым ведаў |
| Я застаўся абыякавым | Дапамагаў іншым | Не зразумеў |

1. **Дамашняе заданне:** практ.116.